Сямейная газета



**Сем міфаў пра масаж**



**Як рэагаваць на дзіцячую рэўнасць**



**Чаму доктару важна ведаць мову?**

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 173 (28283)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Гронкі з-пад Гродна



Фота БЕЛТА.

Генадзь ГУЛЕВІЧ вырошчваннем вінаграду на сваім хутары ў Гродзенскім раёне займаецца ўжо 25 гадоў. Плошча вінаградніку на яго ўчастку за гэты час павялічылася да пяці сотак. У спрыяльны год з куста ўдаецца сабраць 4-5 кілаграмаў ягад. Сёлета ўраджай так сама не падвёў.

## ЛІЧБА ДНЯ

**$4 млрд 711,9 млн**

*у эквіваленце склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі ў жніўні ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду, павялічыўшыся за апошні месяц на $82,3 млн. Падтрыманню золатавалютных рэзерваў садзейнічалі паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў Беларусі і Нацыянальным банкам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама паступленні ад спагнання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9536 | ▼ |
| Еўра | 2,1962 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0731 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Харчовая бяспека

## БУДУЧЫНЯ — ЗА ДАКЛАДНЫМ ЗЕМЛЯРОБСТВАМ



**Галоўнай задачай айчынных навукоўцаў-аграрыяў цяпер становіцца атрыманне максімальна магчымага ўраджаю пры мінімуме выдаткаў. Менавіта дакладнае земляробства можа дазволіць скарацiць спажыванне паліва на 40 працэнтаў, гэтак жа зменшацца расходы ўгнаенняў, пестыцыдаў і іншых сродкаў, падаміў намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і вытворчасці Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ.**

СТАР. 4

■ Грошы

## НА РУКАХ ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ «СТАРАЯ» ДРОБЯЗЬ

**А самая буйная банкнота ў 500 рублёў у аддзяленнях банкаў пакуль не прапісалася**

**Яшчэ напярэдадні грандыёзнай фінансавай падзеі адзначалася, што праведзеная дэнамінацыя спросціць разлікі ў паўсядзённым жыцці як звычайных жыхароў краіны, так і тых, хто непасрэдна ў працы сутыкаецца з лічбамі. Нам паабяцалі, што ніякага павышанага ажыятажу наконт новых грошай не будзе. Што не ўзнікне цяжкасцяў і пры разліках у гандлёвых аб'ектах, дзе старыя і новыя цэннікі былі выстаўлены загадзя. З новымі грашыма мы жывём ужо больш за два месяцы і крыху да іх прывыклі. Таму цяпер паспрабуем спакойна адшукаць плюсы, а магчыма, і слабыя месцы хаджэння нашай валюты ў новым фармаце...**

### Даюць рэшту новымі, а тлумачаць у маштабе старых



На мой погляд, самае складанае для пакупнікоў сёння, гэта паралельнае абарачэнне розных нацыянальных купюр у гандлёвай сетцы. А вось з 1 студзеня 2017-га магазіны ўжо не будуць прымаць старых грошай, хоць абмяняць іх можна будзе па 31 снежня 2019 года ўключна ў Нацыянальным банку, банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!